

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №1 (9)
Верасень - кастрычнік 2020

## У нумары:

**З пачаткам новага навучальнага года!**
Віншаванне адміністрацыі і прафкама ўстановы адукацыі **Стар. 1**

**Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў** **Стар. 2**

**Мы надзейныя рабяты! Наша імя - Акцябраты!** **Стар. 3**

**Святочны канцэрт, прысвечаны Дню настаўніка** **Стар. 4**

**Шосты школьны дзень** **Стар. 5-6**

# З пачаткам новага навучальнага года!

## *Дарагія школьнікі, паважаныя бацькі і настаўнікі!*

Сардэчна віншуем вас з Днём ведаў і пачаткам новага навучальнага года! Наперадзе ў вас месяцы сур'ёзнай вучобы, зносін з сябрамі, поспехаў і клопатаў. Набірайцеся вопыту і ведаў, вучыцеся сваёй працай і талентам прыносіць максімальную карысць. Імкніцеся быць патрэбнымі нашай Дзяржыншчыне і Рэспубліцы Беларусь, поспехі якіх шмат у чым залежаць ад вас.

Паважаныя настаўнікі! Ад вашага прафесіяналізму, педагагічнага таленту, творчасці, душэўнай шчодрасці і мудрасці залежыць будучыня нашых навучэнцаў. Няхай Дзень ведаў будзе ўпрыгожаны кветкамі і дзіцячымі ўсмешкамі, напоўнены цёплымі і добрымі словамі.

Ад усёй душы жадаем школьнікам высокіх дасягненняў у вучобе, цікавых і яркіх старонак школьнага жыцця. Настаўнікам – настойлівасці, вытрымкі і цярпення ў дасягненні пастаўленых задач. Няхай бацькі ганарацца поспехамі сваіх дзяцей і дапамагаюць ім рэалізоўваць і раскрываць іх таленты і магчымасці. Няхай новы навучальны год стане паспяховым для ўсіх!

*Адміністрацыя і прафкам установы адукацыі*

# Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў



1 верасня ва ўсіх установах адукацыі нашай краіны празвінеў першы званок, азнаменаваўшы пачатак новага навучальнага года.

У цэнтры ўвагі на лінейцы – першакласнікі: Барысевіч Ганна-Марыя, Безмен Цімур, Гуткоўскі Уладзіслаў, Мнішко Міхаіл, Кудзелка Кірыл; і выпускнікі: Маглена Максім, Маісеенка Таццяна, Самец Міхаіл, Саўчук Аліна і Халееў Дзмітрый.

Дырэктар школы Аляксандр Сяргеевіч Крыварот павіншаваў усіх з пачаткам новага навучальнага года, пажадаў навучэнцам, настаўнікам, бацькам - новых поспехаў і дасягненняў.



На ўрачыстай лінейцы прысутнічаўі ганаровы госць Кунц Вадзім Уладзіміравіч – дырэктар філіяла “Фалько-Агро” ААТ “Агракамбінат “Дзяржынскі”.

Аляксандр Сяргеевіч Крыварот і Вадзім Уладзіміравіч Кунц уручылі першакласнікам падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На старонках выдання “Беларусь – наша Радзіма” адлюстраваны ўсе сучасныя дасягненні беларусаў: ад эканомікі да навукі і спорту. Сотні ілюстрацый раскажуць школьнікам пра гісторыю, геаграфію і праслаўленых людзей нашай Радзімы.





# Мы надзейныя рабяты!
# Наша імя - Акцябраты!




14 верасня 2020 года шэрагі грамадскага аб'яднання "Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя" папоўніліся новымі членамі - акцябраты. Імі сталі вучні 2 класа Чэрнікаўшчынскага вучэбна-педагагічнага комплексу: Барысевіч Багдан, Барысевіч Варвара, Данец Цімафей і Кулікоўскі Яўген.

Прыём у піянерскую арганізацыю малодшых школьнікаў быў праведзены ва ўрачыстай абстаноўцы на зборы дружыны адначасова з рытуалам прысваення звання «Акцябраты».

Ганаровае права прымацаваць акцябрацкія значкі было дадзена шэфам другакласнікаў - вучням 6 класа.









Акцябраты - члены арганізацыі ва ўзросце ад 7 да 10 гадоў. Навічкі ў піянерскіх справах, гатовыя прыняць і працягнуць традыцыі і гісторыю Піянерыі.

***Октябренок, не забудь –***
***В пионеры держишь путь.***

# Святочны канцэрт, прысвечаны Дню настаўніка

На святочным канцэрце з нагоды Дня настаўніка 2 кастрычніка ва ўстанове гучалі словы падзякі ад навучэнцаў для сваіх педагогаў.

Дырэктар школы Аляксандр Сяргеевіч Крыварот выступіў з віншаваннем і адзначыў добрасумленную працу педагогаў установы, уручыў ім падзякі. Без увагі не засталіся і ветэраны педагагічнай працы.








Вучні здзівілі гледачоў сваімі яркімі канцэртнымі нумарамі. Гучалі песні, вершы. Былі і танцы! Гэты дзень прайшоў у атмасферы ўзаемаразумення і бязмежнай удзячнасці.











# Шосты школьны дзень

## Чэрнікаўшчынкі паўмарафон



5 верасня ва ўстанове прайшоў паўмарафон сярод навучэнцаў 5-9 класаў. Па выніках спаборніцтваў былі вызначаны пераможцы. Імі сталі:

***1 месца - Маглена Максім, вучань 9 класа***

***2 месца - Самец Міхаіл, вучань 9 класа***

***3 месца - Ільючык Ілля, вучань 7 класа.***

Хлопцы былі ўзнагароджаны граматамі і медалямі.

Віншуем пераможцаў і жадаем ім не спыняцца на дасягнутым !!!







## Працоўная акцыя “Захаваем ураджай!”

5 і 12 верасня ў Чэрнікаўшчынскім вучэбна-педагагічным комплексе кіпела праца. У рамках працоўнага дэсанта "Захаваем ўраджай" педагагічны калектыў установы сумесна з навучэнцамі працаваў з самай раніцы.

Ураджай быў захаваны!









# Піянерская анлайн-субота




10 кастрычніка навучэнцы нашай школы прынялі ўдзел у новым праекце "Піянерская субота". Ганаровае права адкрыць "Піянерскую суботу" выпала ДУА "Скіпмантаўскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад - сярэдняя школа". Сустрэча прайшла ў рэжыме онлайн. Рабят павіталі старшыня раённага Савета Цітовіч Наталля Уладзіміраўна і старшыня дзіцячай палаты Варанкоў Іван. Удзельнікі сустрэчы актыўна адказвалі на пытанні піянерскага брэйн-рынга.

Эстафету прыняла піянерская дружына імя С.Ф.Юховіча Бараўскага вучэбна-педагагічнага комплексу яслі-сад - сярэдняя школа.







## Гульня-падарожжа “Па старонкам любімых кніг”



24 кастрычніка ў рамках мерапрыемстваў шостага школьнага дня ў бібліятэцы адбылася гульня-падарожжа "Па старонках любімых кніг". У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні 1-6 класаў.

У ходзе гульні дзеці праявілі свае інтэлектуальныя і творчыя здольнасці, адказваючы на пытанні вядучага, удзельнічаючы ў міні-інсцэніроўках.

# Аб’ява!!!

**Да ўвагі навучэнцаў і іх бацькоў!**




З 31 кастрычніка па 6 лістапада ўключна ў школе будзе працаваць школьны аздараўленчы лагер “Вясёлка” з дзённым наведваннем. Вас чакае насычаны і актыўны адпачынак, шматлікія цікавыя справы, спартыўныя мерапрыемствы і вясёлы час з сябрамі!

За падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся да класных кіраўнікоў.

Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у 2 месяцы.
Наступны нумар выйдзе 24 снежня.